**В. А. Лучанкова**

# СЕМАНТЫЧНАЯ СПЕЦЫФІКА БЕЛАРУСКІХ УСТОЙЛІВЫХ ПАРАЎНАННЯЎ З НАЙМЕННЯМІ РЫС ХАРАКТАРУ

Устойлівыя параўнанні – гэта фразеалагічныя моўныя адзінкі, у якіх адзін прадмет ці з'ява супастаўляецца з іншым прадметам ці з'явай на аснове агульнай прыметы. Аб'ектам нашага даследвання паслужылі беларускія устойлівыя параўнанні з найменнямі рыс характару чалавека тыпу *вясёлы як ластаўка*, *дакучлівы як авадзень*, *непастаянны як асенняе надвор'е*.

Метадам суцэльнай выбаркі са «Слоўніка беларускіх народных параўнанняў» намі вылучана 170 такіх адзінак. Выяўлена 39 падстаў, на аснове якіх параўнанні апісваюць характар чалавека. Згодна з адной з прынятых у псіхалогіі класіфікацый рыс характару, гэтыя прыметы падзяляюцца на чатыры групы: 1) маральныя: *дакучлівы*; *добры*, *ласкавы*; *задзірлівы*; *зайздросны*; *з'едлівы*; *злосны*, *злы*; *ласы*, *прадажны*; *не набожны*; *недалікатны*; *нядружны*; *працавіты*; *сварлівы*; *скупы*; *фарсісты*, *ганарысты*; *хітры*; *чэсны*; *шкодны*; *эгаістычны*; 2) валявыя: *жывучы*, *учэпісты*; *неактыўны*; *упарты*; *цвёрды*; 3) эмацыйныя: *балбатлівы*; *безэмацыйны*; *вольны*, *бесклапотны*; *вясёлы*; *гарачы*; *маўклівы*; *невясёлы*; *непастаянны*; *нясмелы*, *далікатны*; *раўнадушны*; *суровы*, *строгі*; *ціхі*, *спакойны*; *шчаслівы*; 4) інтэлектуальныя: *легкадумны*; *цікаўны*; *нецікаўны*; *шпаркі*, *лоўкі*.

Наступным этапам даследвання было вызначэнне рыс, якія з'яўляюцца найбольш частотнымі падставамі ўстойлівых параўнанняў. Вызначана, што найбольшая колькасць параўнанняў будуецца на аснове характарыстык *злосны*, *злы* (22 параўнання), напрыклад, *злосны як звер*, *злая як асенняя муха*, *злы як воўк*; *шпаркі*, *лоўкі* (17 параўнанняў) (*прыткі як блыха*, *спрытны як вавёрка*, *лоўкі як артыст*); *хітры* (17 параўнанняў) (*хітры як змяя*, *хітры як лісіца*, *хітры як сарока*), *ціхі*, *спакойны* (10 параўнанняў) (*пакорны як авечка*, *ціхая як рыба*, *ціхі як вада*); *шкодны* (8 параўнанняў) (*шкодны як кот*, *шкодны як свіння*, *кусlівы як сляпень*). Некаторыя рысы характару, наадварот, сталі падставай толькі аднаго устойлівага параўнання, напрыклад, *раўнадушны* (*халодны як лёд*), *балбатлівы* (*ляскучы як званок*), *суровы* (*грозны як перад меншым начальнікам*), *з'едлівы* (*калючы як бадак*). Гэта можа сведчыць пра тое, што яны не з'яўляюцца цэнтральнымі ў беларускай моўнай карціне свету і маюць меншую значнасць у параўнанні з іншымі.

Праведзены аналіз паказаў, што розныя падставы прадстаўлены ў складзе ўстойлівых параўнанняў рознай колькасцю сінанімічных прыметнікаў.

Найбольшая сінанімічная разнастайнасць вылучана для падстаў шпаркасць, лоўкасць (10 прыметнікаў), злоснасць (9), ціхі, спакойны характар (7), нясмеласць (5) і фарсістасць, ганарыстасць (5).